Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№ 74 (28438)

19 КРАСАВІКА 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Дарогі, якія мы рамантуем… МС

Хто куды, а мы на мора — Мінскае МС

Шлях да ідэальнай таліі

СТАР. 15

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12

ЗРОБЛЕНА З РОЗУМАМ

Без лічбавых тэхналогій зараз немагчыма ўявіць ніводную сферу жыцця. Напрыклад, яшчэ не так даўно высакахуткасны мабільны інтэрнэт або падарожжа ў віртуальную рэальнасць здавалася нечым з разраду фантастыкі, а ўжо сёння адпаведныя прылады робяцца ў прамысловых маштабах. Цікавыя распрацоўкі ў сферы электронікі дэманструюцца на гэтым тыдні на выстаўцы «ТІБО-2017».

Фота Надзеі БУЖАН.

ПЕРШЫ намеснік прэм'ер-міністра Васіль МАЦЮШЭЎСКІ зачытаў падчас урачыстай цырымоніі прывітанне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі гасцям і ўдзельнікам XXIV Міжнароднага спецыялізаванага форуму па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «ТІБО-2017».

— Мерапрыемства ў апошнія гады вельмі маштабнае. Безумоўна, пляцоўка «ТІБО» ў Беларусі карыстаецца заслужаным аўтарытэтам і ў адпаведных кампаній, і ў нашых калег па ЕАЭС, — падкрэсліў Васіль Мацюшэўскі.

СТАР. 3

ЦЫТАТА ДНЯ

Валерый МІЦКЕВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Праект дэкрэта «Аб развіцці прадпрымальніцтва і выключэнні залішніх патрабаванняў, што прад'яўляюцца да бізнесу» закліканы кардынальным чынам змяніць існуючую сістэму адносін паміж дзяржавай і бізнесам. Цяпер дзяржава будзе мінімальна ўмешвацца ў работу суб'ектаў гаспадарання. Бізнес будзе сам сябе рэгуляваць. Каб гэтыя словы былі не проста прыгожай фразай, у праекце прадугледжаны шэраг механізмаў па іх выкананні».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.04.2017 г.

Долар ЗША	1,8797	▼
Еўра	2,0008	▼
Рас. руб.	0,0335	▲
Укр. грыўня	0,0700	▼

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 17074>

■ Ва ўрадзе

Зарплата падрасла

Падведзены вынікі стану эканомікі за першы квартал

Рост рэальнай заработнай платы — 100,5% да студзеня-лютага мінулага года — дасягнуты за кошт павышэння прадукцыйнасці працы. Пра гэта падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў паведаміў **прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ**.

«У цэлым пастаўленыя ў рамках прагнозу на студзень—сакавік гэтага года задачы выконваюцца. Эканоміка паступова выходзіць з рэцэсіі, валавы ўнутраны прадукт на 0,3% перавысіў узровень мінулага года пры прагнозе, як вы памятаеце, 99,6%. Вырасла і прадукцыйнасць працы па ВУП 100,7% пры прагнозе 99,7%, — адзначыў беларускі прэм'ер. — Станоўчы ўплыў аказаў знешні попыт, які расце: тэмп росту экспарту тавараў і паслуг у студзені-лютым склаў 117,4% да аналагічнага ўзроўню мінулага года. Чыста па таварах экспарт вырас на 19,9%, а без уліку нафты і нафтапрадуктаў і калію — без сыравінных тавараў — тэмп росту склаў 131%. Знешнегандлёвыя патокі збалансаваныя, сальда станоўчае — 56,1 мільёна долараў ці 0,7% да ВУП».

Пры гэтым, па словах кіраўніка ўрада, аднаўленне эканамічнага росту забяспечана без урону для макраэканамічнай стабільнасці. Унутраны валютны рынак функцыянуе стабільна, захоўваецца тэндэнцыя чыстага продажу насельніцтвам валюты. Так, за першы квартал прададзена амаль 500 мільёнаў долараў. Захоўваецца станоўчая дынаміка і па рублёвых дэпазітах насельніцтва: за тры месяцы прыраслі на 6,5% (плюс 192 мільёны рублёў).

Замацоўваецца станоўчая тэндэнцыя і ў асноўных галінах эканомікі. У сакавіку прамысловая вытворчасць прырасла яшчэ на 1,2 працэнтнага пункта. Па выніках студзеня— сакавіка мы выйшлі на ўзровень 104,3% да мінулага года. «З ростам спрацавалі ўсе канцэрны і міністэрствы, за выключэннем, па вядомых прычынах, канцэрна Белнафтахім», — адзначыў Андрэй Кабякоў і дадаў, што пры гэтым ёсць спадзяванне на паляпшэнне сітуацыі «з улікам дасягнутых на мінулым тыдні дамоўленасцяў з расійскімі партнёрамі па газе і нафце». «Важна, што ў эканоміцы выйшлі на рост рэальнай заработнай платы — 100,5% да студзеня-лютага 2016 года. І гэты рост забяспечаны за кошт прадукцыйнасці працы. Меры па збалансаваным росце заработнай платы на ўстаноўлены кіраўніком дзяржавы ўзровень — 1000 рублёў — нараўне са сніжэннем выдаткаў і павышэннем эфектыўнасці ва ўсіх сферах эканомікі дазволяць выйсці на запланаваны ўзровень рэальных існуючых грашовых даходаў насельніцтва», — дадаў прэм'ер-міністр.

«У першым квартале эканоміка выйшла на ўзровень, які запланаваны на першае паўгоддзе: па прагнозе ВУП першага паўгоддзя павінен быць 100,2%», — падсумаваў Андрэй Кабякоў.

Вераніка ПУСТАВІТ.

■ «Звязда» даследуе праблему

«РАСТВАРАЛЬНІК»

Ці патрэбны алкаголікам выратавальны круг?

Яна растварае ўсё — грошы, здароўе, сям'ю... І не трэба думаць, што пад яе ўладу трапляюць толькі слабыя людзі. Ці павернецца язык сказаць пра чэмпіёна свету, што ў яго няма сілы волі? Але і такія спяваюцца. Хіба мог бы слабы чалавек уначы без грошай знайсці 100 грамаў? Многія з тых, хто вырваўся з алкагольнай залежнасці, становяцца паспяховымі бізнесменамі альбо пераключаюцца на ўладкаванне свайго побыту, будуюць дамы.

Але ад алкагалізму церпяць не толькі аматары чаркі і іх блізкія. Гэта сур'ёзная эканамічная праблема.

— Спецыялісты падлічылі, што на адзін рубель гарэлкі з цягам часу можа прыпадаць 8 рублёў выдаткаў, бо алкагалізм — гэта траўмы, судзімасці, утрыманне ЛПП. І нават калі чалавек кінуў піць, яго трэба лячыць ад хвароб, прычынай якіх стала злоўжыванне спіртным. А калі па віне мужа алкаголіка яго жонка ўсю ноч не спала, ці будзе на рабоце ад яе эканамічная аддача? — заўважае **старшыня праўлення грамадскага аб'яднання «Цэнтр даверу «Надзея і вылячэнне» Станіслаў КАЎРОЎ**. — У Польшчы я пазнаёміўся з праграмай, якая працуе на вытворчасці. Калі хтосьці са спецыялістаў пачынае выпіваць, з такім чалавекам займаецца кансультант. Каб выхаваць добрага токара, трэба гадоў 10, а звольніць можна за 5 хвілін. Гэта ж эканамічна не выгадна. Лепш яго вылечыць, і няхай працуе і будзе карысным і вытворчасці, і сям'і. Чаму б не паспрабаваць такія метады ў нас? Магчыма, аднаго кансультанта будзе дастаткова на некалькі прадпрыемстваў ці на раён...

— Чаму быць цвярозым і жыць у цвярозасці — розныя рэчы?

— Часам мы кажам: «Паглядзі цвярозымі вачыма». Сапраўды, каб стаць незалежным ад гарэлкі, неабходны цвярозы розум. Так, зрыў у чалавека, які пэўны час устрымліваўся ад алкаголю, пачынаецца не з чаркі, а з думкі пра яе. А падстаў можна знайсці колькі хочаце: званок сябра, добрае надвор'е, дзень нараджэння сабакі, прыгожа аформленыя вінна-гарэлачныя вітрыны, міма якіх чалавек прайшоў. Нават абыякавыя да алкаголю людзі часам прызнаюцца, што, калі бачаць прыгожыя этыкеткі на алкаголі, ім хочацца пакаштаваць яго.

СТАР. 15